УДК 94(476)
ББК 63.(4 Беи)
С916

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ

Рэдкалегія:
старшыня арганізацыйнага камітэта канферэнцыі, доктар гістарычных навук, прафесар, дэкан гістарычнага факультэта БДПУ *М.М. Забаўскі*;
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ *А.П. Жытко* (навук. рэд.);
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі новага і навейшага часу БДПУ *Г.А. Космач*;
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі Беларусі БДПУ *А.М. Люты*;
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры айчыннай і сусветнай гісторыі БДПУ *В.А. Пілецкі*;
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі старажытных цывілізацый і сярэднявечча БДПУ *У.В. Тугай*;
доктар гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі старажытных цывілізацый і сярэднявечча БДПУ *М.І. Мініцкі*;
доктар гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі Беларусі БДПУ *М.К. Сакалоў*;
доктар гістарычных навук, прафесар кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ *В.М. Фамін*;
доктар гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі новага і навейшага часу БДПУ *І.Р. Чыкалава*;
начальнік Вучэбна-выдавецкага цэнтра БДПУ *В.Я. Навагродскі*

**Сучасныя** падыходы да вывучэння крыніц па гісторыі Беларусі. Да 1000-годдзя
С916 летапіснай Літвы: матэрыялы Рэсп. навук.-тэарэт. канф., г. Мінск, 18 снеж. 2009 г. / Бел. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка; рэдкал. М.М. Забаўскі, А.П. Жытко (навук. рэд.), Г.А. Космач і інш. – Мінск: БДПУ, 2009. – 248 с.
ISBN 978-985-501-841-5.

У матэрыялах канферэнцыі разглядаюцца сучасныя падыходы да вывучэння крыніц па актуальных пытаннях сацыяльна-эканамічнай і палітычнай гісторыі Беларусі са старажытных часоў да сучаснасці.

Адрасуецца навукоўцам, выкладчыкам, студэнтам вышэйшых навучальных устаноў і ўсім, хто цікавіцца праблемамі айчыннай гісторыі.

**УДК 94(476)**
**ББК 63.(4 Беи)**

ISBN 978-985-501-841-5

© БДПУ, 2009

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

Гістарычны факультэт

# СУЧАСНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ВЫВУЧЭННЯ КРЫНІЦ ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

## *ДА 1000-ГОДДЗЯ ЛЕТАПІСНАЙ ЛІТВЫ*

*Матэрыялы Рэспубліканскай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі*
г. Мінск, 18 снежня 2009 г.

Мінск 2009

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ДАКУМЕНТЫ ПА ГІСТОРЫІ ВКЛ НА СТАРОНКАХ ПАДРУЧНІКА ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ ДЛЯ 7-га КЛАСА АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНЫХ УСТАНОЎ

**А.А. Корзюк (г. Мінск, БДПУ, канд. пед. навук)**

Пераход да 11-гадовай сістэмы адукацыі, які адбыўся ў 2008/2009 навучальным годзе, выклікаў істотныя змены ў структуры школьнай гістарычнай адукацыі. У прыватнасці, змест гістарычнай адукацыі быў пабудаваны ў адпаведнасці з лінейным прынцыпам. Акрамя таго, у аснову перыядызацыі курсаў гісторыі Беларусі быў пакладзены прынцып прыналежнасці беларускіх зямель да таго ці іншага дзяржаўнага ўтварэння [1, с. 5]. Гэта, у сваю чаргу, прывяло да неабходнасці стварэння новых вучэбных дапаможнікаў для вучняў агульнаадукацыйных школ.

У адпаведнасці з Канцэпцыяй вучэбнага прадмета "Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі" і дзеючымі вучэбнымі праграмамі [2, с. 31–35], гісторыя беларускіх зямель у складзе Вялікага княства Літоўскага (другая палова XIII – першая палова XVI ст.) вывучаецца ў 7 класе. У 2009 г. быў выдадзены новы вучэбны дапаможнік для школьнікаў [3], змест якога ў поўнай меры адпавядае праграме. Яго аўтарамі з'яўляюцца вядомыя беларускія гісторыкі Г.В. Штыхаў, Ю.М. Бохан і метадыст М.А. Краснова. Трэба адзначыць, што дадзены вучэбны дапаможнік з'яўляецца першым айчынным падручнікам для агульнаадукацыйнай школы па дадзеным перыядзе гісторыі Беларусі.

Дапаможнік мае дакладную і зразумелую структуру, якая адлюстроўвае логіку выкладання вучэбнага матэрыялу і дазваляе лёгка арыентавацца ў ім. Уводная частка "Ад аўтараў" выконвае матывацыйную функцыю, выклікаючы папярэдні інтарэс да вывучэння гісторыі Беларусі другой паловы XIII – першай паловы XVI ст., а таксама спрыяе арыентаванню вучняў у тэксце вучэбнага дапаможніка. Ва "Уводзінах" даецца кароткая характарыстыка вывучаемага перыяду айчыннай гісторыі і найбольш значных гістарычных крыніц па гісторыі Беларусі другой паловы XIII – першай паловы XVI стагоддзя, а таксама раскрываюцца асаблівасці перыядызацыі гісторыі Беларусі ў сярэднія вякі. У першым раздзеле дапаможніка «Беларускія землі ў сярэдзіне XIII–XIV ст.» разглядаюцца гістарычныя падзеі ад пачатку ўтварэння ВКЛ да Крэўскай уніі і яе наступстваў. Другі раздзел прысвечаны развіццю беларускіх зямель у канцы XIV – сярэдзіне XVI ст. У канцы дапаможніка змешчаны храналагічная табліца асноўных падзей гісторыі Вялікага княства Літоўскага, слоўнік гістарычных паняццяў і спіс літаратуры, што рэкамендуецца для пазакласнага чытання. У цэлым, можна лічыць, што пры напісанні вучэбнага дапаможніка ў дастатковай ступені былі ўлічаны ўзроставыя пазнавальныя магчымасці вучняў 7-га класа і іх адукацыйны ўзровень.



У змесце вучэбнага матэрыялу, вывучаемага ў 7 класе, разглядаецца надзвычай важны перыяд для айчыннай гісторыі, таму для яго эфектыўнага засваення неабходна арганізаваць работу школьнікаў з гістарычнымі крыніцамі, якія ўсебакова адлюстроўваюць падзеі гэтага часу. Таму станоўчым з'яўляецца той факт, што аўтары вучэбнага дапаможніка надалі вялікую ўвагу засваенню вучнямі не толькі змястоўнага, але і дзейнаснага кампаненту вучэбных гістарычных ведаў аб грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным развіцці беларускіх зямель у складзе ВКЛ.

Ён прадстаўлены пералікам адпаведных спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, змешчаных у вучэбнай праграме [2, с. 34–35]: называць храналагічныя рамкі гістарычных падзей, з'яў; вызначаць паслядоўнасць, працягласць гістарычных падзей; вызначаць месцазнаходжанне вывучаемых гістарычных аб'ектаў на гістарычнай карце; вызначаць у гістарычных тэкстах структуру гістарычнага часу (эпоха, перыяд, стагоддзе, год); апісваць гістарычныя падзеі, помнікі культуры; параўноўваць гістарычныя падзеі па ўказаных крытэрыях; раскрываць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі; абагульняць гістарычныя факты, фармуляваць на іх аснове вывады; класіфікаваць і сістэматызаваць гістарычныя факты; раскрываць змест гістарычных паняццяў і канкрэтызаваць іх.

Комплекс пералічаных спосабаў дзейнасці можа быць паспяхова рэалізаваны ў працэсе арганізацыі вучэбнай працы з дакументальнымі гістарычнымі матэрыяламі, што ў рознай ступені рэпрэзентатыўнасці адлюстроўваюць заканамернасці і асаблівасці развіцця беларускага грамадства ў адзначаны перыяд. Пералічаныя спосабы вучэбна-пазнавальнай дзейнасці фарміруюцца праз арганізацыю працы вучняў з метадычным апаратам да тэкстаў дакументаў і матэрыялаў, якія ў дастатковай ступені змешчаны ў дапаможніку.

Пасля тэксту параграфаў і пытанняў і заданняў да яго змяшчаецца рубрыка "Гістарычная крыніца". У яе змест уключаны фрагменты дакументаў, якія дазваляюць паглыбіць і канкрэтызаваць веды вучняў аб тых падзеях і асобах, пра якія расказваецца ў асноўным тэксце параграфа. Яны суправаджаюцца пытаннямі і заданнямі да зместу дакумента, што дазволіць настаўніку арганізаваць сістэматычную работу па фарміраванні ў вучняў адпаведных спосабаў дзеяння з гістарычным тэкстам. Усяго аўтарамі быў падабраны 21 фрагмент гістарычных крыніц. У адпаведнасці з класіфікацыяй дакументальных тэкстаў іх можна размеркаваць наступным чынам:

**1. Дакументы дзяржаўнага характару:** фрагменты з прывілея караля польскага і вялікага князя літоўскага Ягайлы аб хрышчэнні Літвы па каталіцкаму ўзору; прывілея вялікага князя Казіміра ад 1447 г.; Статута ВКЛ 1529 г.; Земскай пахвалы 1529 г. аб абароне дзяржавы; прывілеяў г. Мінску і г. Полацку аб наданні Магдэбургскага права; прывілея вялікага князя літоўскага Жыгімонта ІІ Аўгуста ад 1563 г.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**2. Дакументы міжнароднага характару:** фрагменты з гандлёвага дагавору Гедыміна з Лівонскім ордэнам; акта Крэўскай уніі.

**3. Дакументы гістарычнага характару:** фрагменты з Хронікі Літоўскай і Жамойцкай; "Аповесці аб князях Міндоўгу, Войшалку і Трайдзене"; "Летапісца вялікіх князёў літоўскіх"; нямецкай хронікі; Густынскага летапісу; Баркулабаўскай хронікі; Іпацьеўскага летапісу; хронікі Быхаўца.

**4. Дакументы літаратурнага характару:** фрагменты прадмоў Ф. Скарыны да кніг Бібліі.

Такім чынам, дакументальныя матэрыялы, якія размешчаны ў дапаможніку, маюць шматпланавы характар, што дазваляе азнаёміцца і прааналізаваць розныя бакі жыцця насельніцтва беларускіх земель. На фарміраванне ўменняў вучняў аналізаваць гістарычныя тэксты накіравана памятка "Як працаваць з гістарычнай крыніцай" [3, с. 155], а таксама пытанні і заданні да дакументаў.

На думку расійскіх навукоўцаў Я.Я. Вяземскага і В.Ю. Страловай, у аснову аналізу зместу гістарычных дакументаў на ўроках гісторыі павінен быць пакладзены шматузроўневы падыход [4, с. 16–17]:

- *да першага ўзроўню* адносяцца пытанні, якія дапамагаюць устанавіць асобу аўтара дакумента, час, месца і абставіны яго стварэння, а таксама вызначыць від крыніцы;
- пытанні *другога ўзроўню* накіраваны на выбарачнае чытанне крыніцы з мэтай вылучэння галоўных і істотных фактаў, пра якія распавядае аўтар, іх прычын і вынікаў, а таксама аўтарскіх ацэначных выказванняў;
- пытанні *трэцяга ўзроўню* звязаны з каштоўнасным аналізам дакумента, што прадугледжвае вызначэнне каштоўнасных установак гістарычных дзеячаў або арганізацый, прадстаўленых у дакуменце, а таксама самога аўтара;
- на *чацвёртым узроўні* адбываецца крытыка крыніцы. Вучні спрабуюць пацвердзіць або абвергнуць дастаковернасць дакумента, растлумачыць матывы яго аўтара;
- пытанні *пятага ўзроўню* завяршаюць сістэмны аналіз гістарычнага тэксту і праясняюць яго значнасць для вывучэння канкрэтнай тэмы або даследавання вучэбнай праблемы.

Аднак праведзены аналіз пытанняў і заданняў да дакументаў, змешчаных у вучэбным дапаможніку для 7-га класа пацвярджае вывад, зроблены Я.Я. Вяземскім і В.Ю. Страловай аб тым, што нягледзячы на якаснае абнаўленне зместу гістарычнай адукацыі, сярод пытанняў і заданняў да дакументаў у школьных падручніках пераважаюць тыя, што накіраваны толькі на чытанне і выбарачны пераказ крыніцы [4, с. 14]. Прывядзем прыклады сістэмы шматузроўневых пытанняў і заданняў да канкрэтных відаў дакументальных тэкстаў [5, с. 63–65]:

**1. Да дакументаў дзяржаўнага характару** (указы, законы, пастановы, граматы і г. д.):



а) Калі, дзе і чаму з'явіўся гэты дакумент? Апішыце гістарычныя ўмовы яго стварэння.

б) Хто з'яўляецца аўтарам дакумента? Што вам вядома пра гэтага чалавека, яго жыццё і дзейнасць?

в) Знайдзіце асноўныя (новыя) паняцці, выкарыстаныя ў дакуменце, і растлумачце іх.

г) Інтарэсы якіх слаёў, груп, класаў грамадства адлюстроўваюць артыкулы гэтага дакумента або ён увесь у цэлым?

д) Чым адрозніваецца гэты дакумент ці яго асобныя палажэнні ад падобных дакументаў, якія існавалі раней або аналагічных у іншых краінах?

е) Да якіх вынікаў, змен у дзяржаве і грамадстве прывяло або магло прывесці ўвядзенне гэтага дакумента?

**2. Да дакументаў міжнароднага характару** (дагаворы, пагадненні і г. д.):

а) Пакажыце на карце дзяржавы, якія склалі гэты дакумент.

б) Ахарактарызуйце гістарычныя ўмовы яго стварэння.

в) Назавіце асноўныя палажэнні дакумента.

г) Якія змены ў палітычным, эканамічным, тэрытарыяльным плане адбыліся або прапаноўваліся згодна гэтаму дакументу? Ацаніце іх значэнне для кожнай з краін, якія маюць да яго дачыненне.

д) Дайце агульную ацэнку дадзенаму дакументу.

**3. Да дакументаў гістарычнага характару** (летапісы, хронікі і г. д.):

а) Якому перыяду гісторыі, якой краіне, якім падзеям прысвечаны дакумент?

б) Пакажыце на карце месца, дзе адбываліся адзначаныя ў дакуменце падзеі.

в) Вызначце час, у які адбываліся дадзеныя падзеі.

г) Як аўтар дакумента тлумачыць прычыны, разглядае ход і вызначае значэнне гістарычных падзей?

д) Як аўтар адносіцца да апісваемых ім падзей і дзеячаў? Як ацэначныя выказванні аўтара звязаны з характарам гэтага дакумента і абставінамі яго стварэння?

е) Ці выклікаюць давер прыведзеныя аўтарам звесткі? Чаму?

ж) У чым пазіцыя аўтара супадае або не супадае з пунктам гледжання яго сучаснікаў або нашчадкаў на гэтыя гістарычныя факты? Чым можна растлумачыць гэтае падабенства або адрозненне?

з) Ацаніце навуковую, пазнавальную, гістарычную значнасць гэтага дакумента.

**4. Да дакументаў літаратурнага характару** (гістарычная проза, паэзія, драматычныя творы, эпас, міфы, песні і г. д.):

а) Пакажыце на карце месца, дзе адбываецца дзеянне, апісанае ў крыніцы.

б) Вызначце прыкладны час дзеяння ці час напісання твора.



РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

в) Якія вобразы гістарычных герояў і падзей стварае аўтар? Што падаецца вам у гэтых вобразах перабольшаным? Як вы думаеце, з якой мэтай аўтар твора зрабіў гэта?

г) Як аўтар тлумачыць учынкі сваіх герояў? Ці згодны вы з яго аргументамі?

д) Да якога грамадскага слоя належаў аўтар? Наколькі аб'ектыўным ён аказаўся ў перадачы падзей ці ён зусім да гэтага не імкнуўся?

е) У якіх літаратурных творах вы сустракалі падобны сюжэт? Чым можна растлумачыць яго распаўсюджанасць (або наадварот)?

Такім чынам, калі ў ходзе далейшай дапрацоўкі і ўдасканалення зместу вучэбнага дапаможніка па гісторыі Беларусі другой паловы XIII – першай паловы XVI ст. пры распрацоўцы пытанняў і заданняў будуць улічаны відавыя своеасаблівасці дакументаў і шматузроўневы падыход да аналізу іх зместу, то работа школьнікаў па іх вывучэнні не будзе заключацца толькі ў «вывуджванні» інфармацыі з крыніцы, а стане іх далучэннем да творчай навуковай працы гісторыка, што значна палепшыць эфектыўнасць засваення як змястоўнага, так і дзейнаснага кампанентаў вучэбных гістарычных ведаў.

### Літаратура


1. Концепция учебного предмета «Всемирная история. История Беларуси»: утв. приказом Министерства образования Республики Беларусь № 675 29.05.2009 // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2009. – № 7. – С. 3–7.
2. Учебные программы для общеобразовательных учреждений с русским языком обучения. Всемирная история. История Беларуси. V–XI классы / Нац. ин-т образования. – Минск, 2009. – 96 с.
3. Штыхов, Г.В. История Беларуси: вторая половина XIII – первая половина XVI в.: учеб. пособие для 7-го кл. общеобразоват. учреждений с рус. яз. обучения / Г.В. Штыхов, Ю.Н. Бохан, М.А. Краснова; под ред. Ю.Н. Бохана. – Минск: Нар. асвета, 2009. – 159 с.
4. Вяземский, Е.Е. Материалы курса «Как преподавать историю в современной школе: теория и методика»: лекции 5–8 / Е.Е. Вяземский, О.Ю. Стрелова. – М.: Пед. ун-т «Первое сентября», 2006. – 100 с.
5. Стрелова, О.Ю. Формы учебных занятий по истории / О.Ю. Стрелова, Е.Е. Вяземский // Настольная книга учителя истории: 5–11 классы / Авт.-сост. М.Н. Чернова. – М.: Эксмо, 2006. – С. 48–70.




## ВЫВУЧЭННЕ ГІСТАРЫЧНЫХ КРЫНІЦ ЯК СРОДАК РЭАЛІЗАЦЫІ КАМПЕТЭНТНАСНАГА ПАДЫХОДУ Ў НАВУЧАННІ ГІСТОРЫІ


**І.І. Багдановіч (г. Мінск, БДПУ, дацэнт)**
**А.І. Багдановіч (г. Мінск, БНТУ, дацэнт)**


Упершыню паняцце "кампетэнцыя" пачало выкарыстоўвацца ў 70-х гг. XX ст. у ЗША для вызначэння якасцей паспяховасці ў прафесійнай дзейнасці ў сферы бізнесу. З гэтага часу кампетэнцыі пачалі разглядацца як складовая частка любой паспяховай прафесійнай дзейнасці. Яны пачынаюць пранікаць у адукацыю і зараз займаюць цэнтральнае месца ў сучаснай сістэме адукацыі краін Захаду [1, с. 5]. Гэта звязана ў першую чаргу з развіццём інфармацыйных тэхналогій. Яно прывяло не толькі да павелічэння ў дзесяткі разоў аб'ёму спажываемай інфармацыі, але і да яе хуткага старэння і няспыннага абнаўлення. Нават спіс асноўных прафесій на Захадзе пачаў абнаўляцца на 50 % кожныя 7 гадоў. Таму, каб быць паспяховым, сучаснаму чалавеку не толькі прыходзіцца адносна часта мяняць месца работы, але і перакваліфікавацца за жыццё ў сярэднім 3–5 разоў.

У такіх умовах прадуктыўнасць прафесійнай дзейнасці залежыць не ад валодання раз і назаўсёды засвоенай інфармацыяй, а ад умення арыентавацца ў інфармацыйных патоках, ініцыятыўнасці, умення спраўляцца з праблемамі, шукаць і выкарыстоўваць недастаючыя веды або іншыя рэсурсы. Адпаведна сур'ёзна мяняюцца патрабаванні да супрацоўнікаў. Месца эфектыўна спраўляючагася са сваімі абавязкамі выканаўцы заняў вобраз работніка ініцыятыўнага, які ўмее браць адказнасць на сябе і прымаць рашэнне ў нявызначаных, нестандартных сітуацыях, які ўмее працаваць у групе на агульны вынік, самастойна вучыцца, каб кампенсіраваць недахоп прафесійных ведаў, неабходных для вырашэння канкрэтнай праблемы.

Разам з тым праблематыка кампетэнцый не абмяжоўваецца рамкамі паспяховай прафесійнай дзейнасці. Гэта праблема агульначалавечая, скіраваная на вырашэнне не толькі прафесійных, але і асабістых, сямейных і агульнаграмадзянскіх задач. На думку І.А. Зімняй, ідэальны тып чалавека сучаснага дэмакратычнага грамадства – гэта самастойны, прадпрымальны, адказны, камунікабельны, талерантны чалавек, здольны бачыць і вырашаць праблемы аўтаномна, а таксама ў групах, гатовы і здольны пастаянна вучыцца новаму ў жыцці і на рабочым месцы, самастойна і пры дапамозе іншых знаходзіць і прымяняць інфармацыю, працаваць у камандзе і г. д. [2, с. 21].

Неабходнасць навучання пералічаным кампетэнцыям, па сутнасці, з'яўляецца адказам сістэмы адукацыі на выклікі сучаснага грамадства, якое характарызуецца ўзрастаючай складанасцю і дынамізмам. Таму і кампетэнтнасны падыход да навучання скіраваны на тое, каб не павялічваць аб'ём інфармаванасці чалавека ў розных прадметных абласцях, а дапамагчы людзям самастойна вырашаць



РЕПОЗИТОРИЙ БНТУ